# Нізамі Гянджэві: рамантык назаўсёды

**Сёлетні год у Азербайджане абвешчаны Годам Нізамі Гянджэві, выбітнага прадстаўніка сусветнай літаратуры і класіка персідскай паэзіі, які жыў і тварыў у XII стагоддзі ў адным з найбуйнейшых гарадоў і культурных цэнтраў Азербайджана — Гянджэ. Эпічная паэзія Нізамі Гянджэві адметная тым, што творца насыціў яе размоўнай мовай і надаў ёй рэалістычны стыль і гісторыка-культурны фон.**



*Нізамі Гянджэві.*

Юбілей Нізамі адзначаецца ў розных краінах. З удзелам Пасольства Азербайджанскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь урачыстае святкаванне 880-годдзя магутнага майстра слова, паэта-рамантыка і мысліцеля адбылося нядаўна і ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Адкрыла літаратурна-музычную імпрэзу генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аксана Кніжнікава. Яна зрабіла экскурс у гісторыю супрацоўніцтва паміж кніжніцамі Беларусі і Азербайджана. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Азербайджанскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Ульві Бахшаліеў выказаў спадзяванне на паглыбленне стасункаў нашых краін у культурнай, навуковай і творчай сферах.

Дырэктар Нацыянальнага музея азербайджанскай літаратуры імя Нізамі Гянджэві, дэпутат парламента Азербайджанскай Рэспублікі, доктар філалагічных навук, прафесар Рафаэль Гусейнаў распавёў аб жыцці паэта і паслядоўніках яго творчасці. Ён перадаў у бібліятэку кнігі класікаў азербайджанскай літаратуры.

Пра тое, на чым трымаецца папулярнасць вялікага творцы, чаму яго шэдэўры па-ранейшаму запатрабаваныя — іх чытаюць, вывучаюць і даследуюць, — разважалі старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец, дырэктар філіяла «Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы» Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Іван Саверчанка і іншыя выступоўцы. Студэнты сталічных ВНУ чыталі вершы Нізамі Гянджэві, гучалі і музычныя творы.

Была прэзентавана адметная выстаўка твораў Нізамі Гянджэві, якія сталі ўпрыгажэннем бібліятэчных і музейных збораў. У іх шэрагу — выданні першай паэмы «Скарбніца таямніц» і паэмы «Хасроў і Шырын», якая здзейсніла пераварот у літаратурным жыцці таго часу, прынесла літаратару славу. Героі яго твораў — Хасроў і Шырын, Лейлі і Меджнун, Іскандэр — да гэтага часу застаюцца агульнавядомымі як ва ўсім ісламскім свеце, так і ў іншых краінах. Частка выданняў выдатна ілюстравана вядомымі мастакамі.

Асобна былі прадстаўлены літаратуразнаўчыя, мастацтвазнаўчыя і музыказнаўчыя даследаванні творчасці Нізамі Гянджэві. Завяршэннем экспазіцыі сталі казкі і паэмы, створаныя для дзяцей. Сярод іх — «Казка харэзмскай прыгажуні», «Добры і злы», «Фітнэ» і іншыя.

**Таша ШПАКОЎСКАЯ, фота аўтара**